ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі універсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 36 (485) | Субота, 5 снежня 1981 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

# СЕСІЯ — ЭКЗАМЕН НА СТАЛАСЦЬ

Канец года заўсёды адметны тым, што падводзяцца яго вынікі. Кожны калектыў, кожны чалавек, азіраючыся назад, узважвае дасягнутае, аналізуе пройдзены шлях. Не менш адказны і клапатлівы гэты перыяд для студэнцкай моладзі: хутка пачнецца зімовая залікова-экзаменацыйная сесія. Менавіта яна падагуліць дасягнутае, дасць адказ на пытанне: ці плённа працаваў калектыў універсітэта — і студэнты, і выкладчыкі — у час мінулага семестра.

Для студэнцкай моладзі, камсамольцаў сёлетняя зімовая сесія будзе асаблівай. Напярэдзе важная падзея ў жыцці камсамоліі нашай краіны — XIX з'езд ВЛКСМ. Справа гонару кожнага студэнта зрабіць зараз усё магчымае для паспяховай здачы залікаў і экзаменаў. Кожная гадзіна, праведзеная ў аўдыторыі, павінна быць максімальна насычанай.

У матэрыялах XXVI з'езда КПСС адзначалася: «Вядомыя поспехі савецкай сістэмы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Толькі за апошнія пяць гадоў яна дала нашай народнай гаспадарцы 10 мільёнаў кваліфікаваных спецыялістаў».

Каб і надалей падтрымліваць гонар вышэйшай школы, быць дастойнымі такой высокай ацэнкі, стаць спецыялістамі сапраўды высокай кваліфікацыі, неабходна дабівацца максімальнай аддачы вучэбнага працэсу.

У падрыхтоўцы да экзаменацыйнай сесіі вялікая роля належыць камітэту ЛКСМБ і камсамольскім бюро, вучэбна - выхаваўчым камісіям, саветам выдатнікаў. Менавіта ў іх непасрэдныя абавязкі ўваходзіць кантроль за рэгулярным наведваннем заняткаў, за сістэматычнай і старраннай падрыхтоўкай да іх. Аднак у апошні час назіраюцца частыя, нічым не апраўданыя, пропускі заняткаў. Асабліва шматлікія, як паказваюць вынікі апошніх праверак наведвання заняткаў, пропускі на матэматычным факультэце. Для камсамольскай, прафсаюзнай арганізацый гэтага факультэта, усіх студэнтаў асабліва важна зараз дабіцца стопрацэнтнага наведвання заняткаў, тым больш, што вынікі папярэдніх сесій матэматыкаў былі не бліскучыя.

Важную ролю пры падрыхтоўцы да сесіі і ў час яе правядзення адыгрывае універсітэцкая бібліятэка, чытальныя залы. Гэта асноўная крыніца ведаў, даведніцкі цэнтр для студэнтаў нашай ВНУ. Супрацоўнікі бібліятэкі добра ўсведамляюць сваю адказную задачу і, як заўсёды, зробяць усё ад іх залежачае, каб напружаны час у жыцці універсітэта прайшоў спакойна і дакладна, створаць неабходныя ўмовы для плённых заняткаў у чытальных залах, пастараюцца кожнага студэнта забяспечыць патрэбным падручнікам. Пэўная адказнасць у дакладнай рабоце бібліятэкі належыць і самім студэнтам. Яшчэ ў большай меры, чым у час заняткаў у семестры, ад іх залежыць, каб не было збояў у арганізацыйнай рабоце. Калі ты ўзяў падручнік, даведнік, то ўсведамляй, што ён патрэбен не табе аднаму, памятай пра свайго таварыша, які, магчыма, чакае менавіта гэтую самую кнігу.

Калектывізм праяўляецца асабліва адчувальна ў самых невялікіх студэнцкіх падраздзяленнях — акадэмічных групах. У атмасферы шчырага клопату і ўзаемадапамогі праходзіць падрыхтоўка да сесіі ў лепшых з іх, як, напрыклад, у групе Т-51 эканамічнага факультэта. Тут дасканала ведаюць магчымасці кожнага. Выдатнікі вучобы, тыя, каму асабліва добра вядомы «таямніцы» таго або іншага з вывучаемых курсаў, заўсёды прыдуць на дапамогу сябру, наладзяць імправізаваную кансультацыю ў калідоры факультэта, у пакоі інтэрната. Тут дарэчы будзе сказаць, што добрая вучоба непарыўна звязана з навуковай работай студэнтаў. Як правіла, шырыня кругагляду з'яўляецца стымулам для паспяховай вучобы: у час навуковых даследаванняў з'яўляецца жаданне ведаць як мага больш у сумежных галінах, павышаецца агульны ўзровень адукацыі і культуры.

Час, які застаўся да пачатку сесіі, неабходна выкарыстаць плённа, з поўным усведамленнем задач, ускладзеных на ВНУ партыяй і ўрадам, усім сучасным жыццём. У матэрыялах XXVI з'езда КПСС указвалася: «Больш поўна трэба выкарыстоўваць навуковы патэнцыял ВНУ, у якіх сканцэнтравана амаль палавіна ўсіх нашых дактароў і кандыдатаў навук. Разам з развіццём народнай гаспадаркі мяняецца і попыт на кадры той ці іншай спецыяльнасці. А значыць, і сістэма плавання падрыхтоўкі кадраў ў ВНУ павінна чула рэагаваць на гэтыя перамены».



Лістапад 1943 года, калі савецкія воіны, партызаны вызвалілі г. Гомель ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, упісаны ў гісторыю вобласці залатымі літарамі. Прайшло ўжо 38 гадоў з таго радаснага і светлага дня, а памяць аб ім у сэрцах людзей жыве. Кожны год, 26 лістапада прыходзяць ветэраны, моладзь да брацкіх магіл, помнікаў і абеліскаў, каб ушанаваць памяць воінаў, аддаўшых жыццё за сённяшняе шчаслівае мірнае жыццё.

Адбыўся мітынг, прысвечаны гадавіне з дня вызвалення Гомельшчыны, і ва універсітэцкім парку, каля брацкай магілы загінуўшых воінаў. Сюды прыйшлі студэнты, выкладчыкі універсітэта. Уступным словам мітынг адкрыў намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта У. Кананкоў і прадаставіў слова ветэрану Вялікай Айчыннай вайны, сакратару партыйнага бюро біялагічнага факультэта Васілю Аляксандравічу Хількевічу. Ён гаварыў пра доблесць, адвагу мужнасць савецкіх людзей у грозныя гады ваеннага ліхалецця, заклікаў моладзь свята захоўваць лепшыя традыцыі савецкага народа, змагацца за мір на зямлі.

Мінутай маўчання была ўшанавана памяць загінуўшых воінаў, да падножжа помніка ўскладзены вянкі і кветкі.

**На здымку:** уважліва слухаюць выступленне ветэрана ўдзельнікі мітынгу.

Фота У. Чысціка.

# ПЛЕНУМ АБЛАСНОГА КАМІТЭТА КПБ

2-га снежня адбыўся IV пленум абкома КПБ. На яго былі запрошаны першыя сакратары гаркомаў і райкомаў партыі, якія не ўваходзяць у састаў абкома КПБ, старшыні выканкомаў гарадскіх і раённых Саветаў народных дэпутатаў, першыя сакратары гаркомаў і райкомаў камсамола, старшыні гарадскіх і раённых камітэтаў народнага кантролю, кіраўнікі абласных арганізацый і ведамстваў.

З дакладам «Аб выніках лістападаўскага (1981 г.) Пленума ЦК КПСС і задачах партыйных арганізацый вобласці, вынікаючых з рашэнняў Пленума і прамовы на ім Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша Л. І. Брэжнева» выступіў першы сакратар абкома КПБ **Ю. М. Хусаінаў.**

Па абмеркаванаму пытанню прынята адпаведная пастанова.

*Абмеркавана на партыйным сходзе*

# ПРАЯЎЛЯЦЬ БОЛЬШ АКТЫЎНАСЦІ

На гэтым тыдні ў партыйнай арганізацыі ўпраўлення адбыўся чарговы сход. На ім было разгледжана пытанне аб рабоце камітэта камсамола і прафкома па арганізацыі студэнцкага самакіравання. Заслуханы паведамленні старшыні прафкома Н. Колтышавай і сакратара камітэта камсамола С. Аўсеенкі. Аб рабоце штаба «Камсамольскага пражэктара» расказала яго начальнік І. Шаламіцкая.

У спрэчках выступілі загадчык вучэбна-кансультацыйнага пункта Ул. Родзікаў, супрацоўніца вучэбнага аддзела Л. Малярэнка, намеснік сакратара камітэта ЛКСМБ універсітэта Ул. Чмых, рэдактар шматтыражнай газеты «Гомельскі універсітэт» Ул. Балога, старшыня спортклуба Г. Варатніцкі. У абмеркаванні важнага пытання прыняў удзел рэктар універсітэта Б. В. Бокуць.

На партыйным сходзе адзначалася, што за апошні час у арганізацыі студэнцкага самакіравання зроблена нямала. У гэтым напрамку адшукоўваюцца новыя, апраўдаўшыя сябе формы і метады. Аднак дасягнутае пакуль што не можа задавальняць. Неаслабнай увагі патрабуе цяпер выхаваўчая работа студэнцкай моладзі, барацьба за ўмацаванне дысцыпліны, больш ашчадныя адносіны да сацыялістычнай маёмасці.

Па абмеркаванаму пытанню партыйны сход прыняў адпаведную пастанову.

# СХОД КУРАТАРАЎ

На эканамічным факультэце адбыўся сход куратараў. Асноўная ўвага была ўдзелена першакурснікам. Адзначалася, што асабліва паспяхова пачалі вучобу тыя, хто паступіў на спецыяльнасць «эканоміка працы». У сваім першым універсітэцкім семестры яны старанна наведваюць заняткі, у выкладчыкаў склалася думка, што на факультэт прыйшло добрае папаўненне. Гэта тлумачыцца, у першую чаргу, высокім прахадным балам — 22,5, які неабходна было набраць на ўступных экзаменах, самааддана працай выкладчыкаў факультэта ў групах першакурснікаў.

Некалькі горш абстаіць справы ў групе студэнтаў, якія вывучаюць механізаваную апрацоўку эканамічнай інфармацыі. Па выніках бягучай паспяховасці бачна, што каля дзесяці працэнтаў студэнтаў маюць нездавальняючыя адзнакі. Прычым, і наведванне заняткаў тут намнога горшае.

Ішла на сходзе размова і пра студэнтаў іншых курсаў, якія маюць акадэмічную запазычанасць па тых ці іншых прадметах. Гэта Т. Пінчук і Н. Цуркан (Т-22), І. Чэпелава, А. Юнах (Т-21), М. Кольбе (Т-24), Н. Данілаў, В. Іваноў (Т-34), С. Галавін (0-32), С. Калеснікава (0-33), І. Гузерава, Е. Іванова (Т-41).

На сходзе выступілі куратары Л. Г. Багамаз, Г. К. Котаў, старшы куратар факультэта В. М. Кучмін. Абмяркоўваліся пытанні выканання планаў куратараў, рэгулярнасць наведвання імі інтэрнатаў, дзе жывуць студэнты эканамічнага факультэта, шляхі паляпшэння наведвання заняткаў.

У апошні час стала актуальным пытанне падтрымання эстэтычнага выгляду аўдыторый, іх добрага санітарнага стану. Прынята рашэнне аб замацаванні кожнай аўдыторыі факультэта за пэўнымі студэнцкімі акадэмічнымі групамі і кафедрамі.

**В. ЛАЗУЧЭНКАВА,**
**намеснік дэкана факультэта.**

*У камітэце ЛКСМБ*

# РАЗМЕРКАВАЛІ АБАВЯЗКІ

На гэтым тыдні адбылося пашыранае пасяджэнне зноў выбранага камітэта камсамола універсітэта. На яго былі запрошаны сакратары камсамольскіх бюро курсаў, факультэтаў, груп.

Размеркаваны абавязкі членаў камітэта камсамола: А. Казакову даручана адказваць за арганізацыю вучэбнай і навуковай работы студэнцкай моладзі; В. Жосткін прызначаны старшынёй вучэбна-выхаваўчай камісіі; Т. Сімакова — адказвае за навукова-даследчую работу; грамадскую прыёмную камісію ўзначаліла Н. Ісакава; савет выдатнікаў — Г. Байкачоў; палітыка-выхаваўчы сектар — С. Гуляеў; шэфскі — В. Кузубава; сектар ваенна-патрыятычнага выхавання — Н. Кандратава; М. Строк — спартыўны; А. Аранчык — інфармацыйна-палітычны сектар; І. Шаламіцкая — «Камсамольскі пражэктар»; Н. Сілкіна і Г. Зубарэвіч — культурна-масавы; І. Чыжонак — арганізацыйны; В. Пякарскі — штаб працоўных спраў; У. Васілец — добраахвотную народную дружыну; А. Ляхаў адказвае за грамадска-палітычную практыку; І. Асан-Джалалаў — за арганізацыю вучобы камсамольскага актыву; Р. Емяльянаў узначаліў жыллёва-бытавы сектар; Н. Колтышава — прафком; А. Цяпічава — савет маладых вучоных; Л. Царова — сектар інтэрнацыянальнага выхавання.

На пасяджэнні камітэта камсамола прысутнічалі першы сакратар абкома камсамола У. Давідовіч і першы сакратар Цэнтральнага райкома камсамола Гомеля У. Біран. У. Давідовіч выступіў з кароткай прамовай.

**(Наш кар.)**

